ем как общенаучных методов исследования, так и специально исторических, таких как историко-генетический, историко-ретроспективный, историко-типологический, метод количественного анализа.

**Научная новизна.** Проведен комплексный анализ причин участия мусульманских народов в составе гитлеровских войск (в том числе с учетом национальной и религиозной политики нацистской Германии по этому вопросу).

**Полученные результаты и выводы.** Мусульманские формирования представляли собой отдельную категорию иностранных добровольческих формирований в системе германских вооруженных сил, что было связано с политическими причинами и условиями их создания, а также статусом внутри этой системы. С военной точки зрения это были в основном полноценные боевые части, которые, несмотря на то, что и создавались с определенными политическими целями, тем не менее в целом использовались по своему прямому назначению. В то же время можно отметить определенные особенности видения целей и мотивов формирования мусульманских легионов ведомством Гиммлера, т.е. СС.

**Практическое применение полученных результатов.** Материал работы можно использовать при подготовке учебной и методической литературы по истории Великой Отечественной войны в контексте Второй мировой войны (в особенности, в разделе, посвященном коллаборационистской проблематике).

## МОЎНА-КУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА ІВАНАЎШЧЫНЫ – САМАБЫТНАГА КУТОЧКА Ў СЛАВЯНСКІМ СВЕЦЕ

*Д.У. ХІВУК (студэнтка 1 курса)*

**Праблематыка.** Даследаванне накіравана на асэнсаванне моўна-культурнай прасторы Янава (Іванава), адметнага рэгіёна Берасцейска-Пінскага Палесся. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню мовы янаўскіх лабараў, пытанню ўзнікнення вышэйназванай штучнай мовы. Даследчык спыняецца на найбольш распаўсюджаных назвах мястэчак, прозвішчах, мянушках, якія нагадваюць аб адметнай групе насельніцтва гэтага рэгіёна і іх занятку – "лабарах"; звяртаецца да апісання каравайнага абраду, які захаваўся з даўніх часоў да нашых дзён, яго адметнасцей у разглядаемым куточку Беларусі.

**Мэта працы.** Скласці дыялектны слоўнік лабарскай гаворкі "Мова прадзедаў – мова дзядоў", паколькі ў наш час доля нашчадкаў лабараў сярод агульнага насельніцтва Іванава зусім невялікая і даўно ўжо ніхто не займаецца зборам ахвяраванняў на будаўніцтва храмаў, а значыць, і не з'яўляецца лабарам у літаральным сэнсе слова; пазнаёміць зацікаўленых беларусаў з назвамі мястэчак, прозвішчамі, мянушкамі, найбольш распаўсюджанымі на тэрыторыі Берасцейска-Пінскага Палесся, якія нагадваюць аб адметнай групе насельніцтва гэтага рэгіёна і іх занятку; з каравайным абрадам, які з далёкай даўніны і да нашых дзён шануецца ў мястэчку Моталь Іванаўскага раёна.

**Аб'ект даследавання.** Моўна-культурная прастора Іванаўшчыны.

**Выкарыстаныя методыкі.** Метадалагічным грунтам даследавання з'яўляецца карыстанне прынцыпамі параўнальна-гістарычнага, тыпалагічнага літаратуразнаўчых метадаў.

**Навуковая навізна.** Выпрацавана канцэпцыя захавання культурна-моўных каштоўнасцей на Берасцейшчыне. Вызначана, што палескае вяселле пачыналася з выпечкі каравая, сімвала багацця, дабрабыту. Каравай прысутнічае пры ўсіх асноўных момантах вяселля, а яго прыгатаванне суправаджаецца прыгожым паэтычным абрадам, які ў сваю чаргу ўключае наступныя ганаровыя і адказныя моманты: рашчыненне, замес, гібанне, сажанне ў печ, кавалі, выкуп.

Як сведчыць складзены намі слоўнік лабарскай гаворкі, нягледзячы на тое, што роднай мовай janaўскіх лабараў была мова насельніцтва брэсцка-пінскага рэгіёна, на ёй гаварылі ў сям'і, мелі зносіны з жыхарамі Янава і навакольных вёсак, лабары добра ведалі асаблівую мову, так званую «ліберску гаврідню», яны карысталіся штучнай гаворкай, каб пазбавіцца чужых вушэй. Многія словы са слоўніка лабараў былі запазычаны з грэцкай, лацінскай, нямецкай і іншых замежных моў, другія з'яўляліся вузкалакальнымі і сустракаліся толькі ў якой-небудзь адной мясцовасці, былі і проста скажоныя словы і новаўтварэнні.

**Атрыманыя навуковыя вынікі і высновы.** Янаўскія лабары – адна з цікавых старонак айчыннай гісторыі. Адыходзяць апошнія сведкі мінуўшчыны, даўно ўжо ніхто не займаецца зборам ахвяраванняў на будаўніцтва храмаў, а значыць, і не з'яўляецца лабарам у літаральным сэнсе слова. Але яшчэ працягвае захоўвацца слова «лабар» у другім значэнні, як назва патомных жыхароў горада, продкі якіх здаўна жылі ў Янаве. Неабходна адзначыць, што даследчык прапануе розныя версіі адносна паходжання слова "лабар". На Беларусі ўласныя прафесійныя збіральнікі сродкаў на патрэбы царквы сталі дзейнічаць з часоў Рэчы Паспалітай. Па выніках сабранага матэрыялу аўтар прыходзіць да высновы аб лабарстве як прафесійным занятку жыхароў Іванаўшчыны, і не толькі гэтага рэгіёна. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню штучных моў на тэрыторыі Беларусі, спыняецца на адметнасцях тайнай мовы лабараў. Высвятляюцца аб'ектыўныя прычыны знікнення лабарства як інстытута увогуле. Безумоўна, дваццатае стагоддзе прынесла ў жыццё Янава шмат новага, асаблівасці культуры і быту, псіхалогіі лабараў паступова нівеляваліся на карысць поўнага збліжэння з рысамі новых перасяленцаў з навакольных вёсак. Тым не менш, распаўсюджаныя назвы мястэчак, прозвішчы, мянушкі на тэрыторыі Берасцейска-Пінскага Палесся нагадваюць аб адметнай групе насельніцтва гэтага рэгіёна і іх занятку, аб чым сведчыць сабраны матэрыял.

**Практычнае прымяненне атрыманых вынікаў.** У наш час шмат робіцца дзеля духоўнага адраджэння беларусаў. Каб маладое пакаленне не згубіла святло традыцый продкаў, мы павіны ведаць, шанаваць і захоўваць народныя звычаі. Запісаны намі каравайны абрад ад жыхароў вёскі Моталь, якім заўжды на Палессі суправаджаўся вясельны абрад, – яскравы прыклад, як мудрыя, дбайныя людзі захоўваюць сваю духоўную культуру, перадаюць яе новым пакаленням. У вялікай ступені гэтаму садзейнічае і Мотальскі музей народнай творчасці. Запісаны каравайны абрад мае і выхаваўчы аспект, бо прымушае задумацца аб адносінах да хлеба, да чалавека, які стварае яго, бо лічыць, што гэта Вялікі Божы Дар. Нездарма пры падзеле каравая, кожнаму госцю прапануецца выкупіць яго кавалачак, нітачку, шышачку. Даследаванне пра лабараў сведчыць, што Іванава – самабытны куточак роднага краю, адметны рэгіён у славянскім свеце, гісторыю якога павінны ведаць берасцейцы.